УДК 882.6-1

*Т.І. БОРБАТ*

# ПЕЙЗАЖ У ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАХ С.ГРАХОЎСКАГА

Адносіны чалавека да прыроды вызначаюць у многім яго характар, яго як асобу. Прырода развівае фантазію чалавека, “яна здольна перарадзіць яго, калі той адкрываецца ёй. Само раскрыццё творчых здольнасцей чалавека залежыць ад стану прыроды і адносін чалавека да яе” [1, с. 129].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Вялікая колькасць пейзажных вершаў у лірыцы С.Грахоўскага гаворыць пра цікавасць паэта да свету прыроды. Творы такога кшталту дапамагаюць нам раскрыць багаты ўнутраны свет лірычнага героя. Добрая асацыятыўнасць, яркая метафарыстычнасць, свежасць параўнанняў ствараюць па-сапраўднаму мастацкія карціны прыроды, адухоўленыя чалавечым пачуццём.

Свет прыроды ў творчасці мастака перш-наперш асацыіруецца з маленствам. Маленства – гэта зоры, "што плаваюць у рэках", сінія касачы, вузенькая пясчаная каса ("Пачатак"). З маленствам звязаны ўспаміны пра першы начлег з кастром, які дагарае і "агеньчыкам мільгае ў цьмяных вачах" старога каня, што "наскубся і спутаны стаяў ля агню", сны на "цёплым кажусе" пра лесуна і русалку, што "адгукаецца крыкам гусіным, на бераг выходзіць, расчэсвае косы", з якіх, "нібы ягады, падаюць росы"("Начлег").

Паэт умее паказаць прыгажосць зямлі, што "пахне лесам", сунічнаю расою, заўважае, як у цішы "з ліста на ліст скацілася расінка, чуваць – каля апаленага пня са скрыпам прабіваецца асінка"...

Ён стварае такія вобразы, якія не могуць не ўзрушыць сэрца чалавека, гэта – маладзік, які, нібы калыска, гойдаецца над сялом, вясновы снег, падобны на чыстыя старонкі паперы, пасівелыя ад марозу вершаліны дрэў, закурэлы пылам белы шлях, бярэзнік, што "чаканіць золата штодзённа", касцёр "дыміцца верасамі", тлее "жарам журавін, шугае полымем рабін".

Матыў адзінства чалавека і прыроды – адзін з вядучых матываў у пейзажнай лірыцы С.Грахоўскага. Але ў гэтым адзінстве існуе супрацьлегласць, супрацьстаянне. Паэт шукае і знаходзіць спосаб звесці гэтае супрацьпастаўленне да мінімуму. Сілай мастацкага слова аднавіць страчаную сучасным чалавекам гарманічную еднасць з прыродай і разам з тым дасягнуць суладдзя ў сваёй душы як частцы прыроды і ў чалавечых адносінах – важны накірунак паэзіі С.Грахоўскага. Цікавы ў гэтым сэнсе верш "Вясна". Істотным у творы з'яўляецца ўздзеянне веснавых змен на стан лірычнага героя, якога вясна не можа пакінуць абыякавым, адчуванне руху ўсёй зямлі праз рух крыг на рэках і "соку ў карэннях пругкіх". Абуджэнне прыроды – жыццё лірычнага героя – жыццё прыроды – жыццё чалавека – ланцужок узаемнай далучанасці чалавека і прыроды праз вобраз героя, які "звязвае" ў гарманічным адзінстве ўсё існае на зямлі. Адносіны героя да свету прыроды з эстэтычных, з асалоды любавання прыгажосцю, перарастаюць у этычныя, выклікаюць у яго высокія маральныя пачуцці: шчырасць, ласкавасць, сяброўства і каханне. Гэта тая сіла, што натхняе чалавека, прыводзіць да творчых зносін з прыродай. Так гарманічнае суладдзе з прыродай С.Грахоўскі пераносіць у свет чалавечага жыцця. Адпаведнасць законам маралі, высокая духоўнасць уносяць у адносіны паміж людзьмі прыгажосць, святло, мелодыю ("Бабіна лета", "Сунічны сок", "Рабінавая ноч", "Вераснёвы вечар", "Павозка").

Неабходна заўважыць, што ў паэта змены ў календары прыроды адэкватныя зменам чалавечых узростаў. Напрыклад, у кнізе "Паэма дарог" паплечнікам чалавека становіцца зіма з яе "празрыстым пухам галубіным", на змену якой вось-вось павінна прыйсці вясна. Снег пасерабрыў пасмы валасоў, аднак і душа і сэрца па-ранейшаму застаюцца маладымі. Лірычны герой не растраціў цяпло душы, умее захапляцца прыгажосцю навакольнага свету, прагне жыцця, маладосці, радасці, ведае: "Буду я пасівелы і толькі ніколі не буду стары", бо магутнай сілай напаўняе чалавека прырода:

*...Бягу па снезе і смяюся,*
*Забыўшыся пра сівізну,*
*Бо зноў вясною спадзяюся*
*Сустрэць наступную вясну*

("Апошні снег" [2, с. 381]).

З надыходам вясны ўсё навокал абуджаецца ("Колеры", "Зялёны ветразь", "Раскрыліся пялёсткі", "Вясной", "Прадвесне"). У лесе, у полі чуецца таемны шэпт,

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

шматгалосы птушыны звон, пульсуюць сокам карэнні, волкае галлё. З абуджэннем ад сну прыроды абуджаецца і ачышчаецца душа чалавека. Перад намі не словы, а фарбы, жывы малюнак. Паэт умее знайсці адпаведны настрой, надаць вершаванай мове тую адзіную інтанацыю, якую вымагае душэўны стан лірычнага героя.

Летам "з рамонкавым пылам і пахам жыта" расцвітаюць палявыя краскі, хвалюецца ад ветру даспелае жыта ў чаканні жніва, расой і мёдам пырскае трава ("Сунічны сок", "Ліпеньскае поле", "Подых лета", "Жнівень", "Жніво").

А восень "дыміцца верасамі і тлее жарам журавін", зіхаціць усімі адценнямі фарбаў ("Колеры", "Верасень", "Асенні дзень"). Гэта пара падвядзення вынікаў; паэт таксама разважае над лёсам сваіх мастацкіх набыткаў:

*Асенні сад – у шале хараства,*
*Рабіна на сябе парчу адзела,*
*Пажоўк чарот, і на лугах трава*
*Пад шызаю расою парудзела.*

*Так і паэзія – зялёная вясной,*
*А восенню – ўсе колеры у ёй*
("Колеры" [3, с.43]).

С.Грахоўскі паўстае перад чытачом майстрам асацыятыўных вобразаў. Мудрагелістыя, незвычайныя, яны заўсёды суправаджаюць яго пейзажныя радкі. Паэт перакрыжоўвае ў пейзажах асацыяцыі прыродна-чалавечага плану і пры іх дапамозе лёгка і натуральна перамяшчае паняцце з рада абстрактнага, лагічнага ў рад пачуццёвы, канкрэтны і наадварот. Напрыклад, канкрэтны вобраз вясны, абуджэння прыроды асацыіруецца ў паэзіі С.Грахоўскага з новым этапам у жыцці чалавека ( "Апошні снег", "Зазімак" ), а надыход зімы – з набліжэннем вясенніх дзён.

Мастак валодае рэдкім уменнем пранікаць у глыбінную сутнасць з'яў, падключаючы дзеля гэтага ўсе свае пачуцці, знаходзіць цікавыя і смелыя сувязі паміж зусім далёкімі адзін ад аднаго і абсалютна рознымі прадметамі і фактамі рэчаіснасці. Яго мэта – не выявіць, а стварыць паэтычны вобраз. Паэт здольны імгненна сінтэзаваць і пераасэнсаваць разнастайныя ўражанні, спалучаць умоўнае з рэальнасцю, і гаворыць аб іх натуральна і пераканаўча, знаходзячы кожны раз незвычайны пункт гледжання на прадмет. Ён бачыць тайну там, дзе, здавалася б, няма нічога загадкавага, нястомна паэтызуе свет, прыроду. Прытым пашыраюцца жанравыя рамкі паэзіі С.Грахоўскага: з'яўляюцца не характэрныя для яго "традыцыйнага стылю" версэт ("Кароткае лета"), элегія ("Элегія").

Малюнкі мілай сэрцу прыроды – гэта яшчэ і ўспаміны аб юнацтве, першым каханні і сустрэчах з каханай жанчынай. Такіх вершаў асабліва шмат у зборніках "Паэма дарог", "Зазімак", "Зачараванасць", "Недапісаная кніга": "У стылай месячнай сінечы", "Мне сняцца суніцы", "У той далёкай маладосці", "Позняя радасць", "Белыя ліпы", "Сцюдзёная ноч", "Белы бэз", "Твае далоні пахнуць першым снегам", "Салаўіная ноч", "Снегапад", "Светлы смутак", "Падзяка грому і дажджу" і інш. Цікава адзначыць, што эмацыянальна афарбаваныя ў першых зборніках пейзажы С.Грахоўскага пачалі набываць медытатыўны накірунак. Аўтар усё часцей стаў схіляцца да праўдзення паралеляў паміж прыродай і жыццём чалавека. Так, напрыклад, вобраз маладзіка стаў прычынай роздумаў паэта над няўмольным бегам часу:

*Мінаюць гады, за гадамі стагоддзі,*
*Над купалам купал, як прывід, узнік.*
*Скуголіць куга, і сякерай па лёдзе*
*Блішчыць маладзік*
("Маладзік" [4, с. 139]).

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Прырода для паэта – гэта як бы частка яго асабістай душы. Прычым дасягаецца гэта натуральна, лёгка і неназойліва. Вобразная паўнакроўнасць вершаў, шчодрасць гукаў, багацце сэнсавых асацыяцый, якія адпавядаюць бязмежнай фантазіі лірычнага героя – з гэтага і пачынаецца непаўторная арыгінальнасць пейзажаў С.Грахоўскага :

*Ударыць ноччу завіруха,*
*На пні сумёты намяце,*
*Ад сцюжы дуб застогне глуха,*
*І сціхне ўсё у немаце.*

*Яліны ў срэбраных шаломах*
*Застынуць у дзівосным сне,*
*А дзяцел у сваіх харомах*
*Зноў тэлеграму б'е вясне...*
("Зачараванасць" [4, с. 91]).

У вершы пра юрмалаўскую восень ("Юрмалаўская восень") мы ўвачавідкі бачам, як "узмор'е зарой занялося, туман асядае густы", "як ранняя восень зграбае і паліць лісты". Сумуе душа паэта, калі "у вулачках ціха і пуста, і толькі шуміць лістапад, рыпіць у разорах капуста, сівее абветраны сад..." Радуе вока ліпеньскае поле ("Ліпеньскае поле"): "чуваць, як жнівень у прыполе дажынкі хмельныя нясе", прыцягвае да сябе лета ("Подых лета"): "хмара з пераспелым громам злавеснай сінькай заплыла і трэснула, а за праломам – бяздонне сіняга святла..."

Прырода – гэта і аб'ект сузірання, аналізу, даследавання, роздуму. У той жа час мастак глядзіць на яе як бы "знутры" яе самой, уважліва імкнецца адчуць знітаванасць лёсу чалавека і прыроды, адчуць навакольны свет душою самой прыроды: "Мне сняцца суніцы", "Адзінота", "Завіруха", "Маладзік". Гэта зблiжае яго бачанне прыроды з лірыкай Д.Бічэль-Загнетавай, Р.Барадуліна.

Лірычны пейзаж у С.Грахоўскага ўзнікае часцей за ўсё з аднаго дакладна знойдзенага вобраза. Мазаічнасць, напластаванне шматлікіх дэталяў – усё, што можа ўскладніць, перагрузіць пейзаж – нехарактэрны для паэта. Найбольш яркая індывідуальная рыса яго пейзажаў заключана ў тым, што зрокавыя вобразы ў іх чаргуюцца з гукавым успрыняццем карціны прыроды. Ад пластычнага пачатку да яўнай перавагі пачатку музычнага – такі рух творчай думкі мастака. Даследчыкі не раз звярталі ўвагу на музычнасць вершаў С.Грахоўскага (Арочка М., Мішчанчук М., Гарэлік Л., Звонак А.).

Таму ўзноўлены мастаком пейзаж заўсёды ўспрымаецца як гукавы. І звычайна штрыхі карціны, якую назірае лірычны герой, нараджаюцца ў гэтай гаме шматгалосся. Так, у вершы "Прадвесне" надзвычай тонка ўзнаўляецца карціна надыходу вясны:

*Хрупае за ноч настылы снег,*
*Але ўжо над заінелым садам*
*Паплыла смуга ліловым чадам*
*Да счарнелых зімнікаў і стрэх.*

*Шаргаціць яшчэ настылы снег,*
*І рыпіць на раздарожжы полаз,*
*Але ў поўдзень акрыялы голас*
*Зазвінеў і раўчуком пабег ...*
("Прадвесне" [4, с. 88-89]).

Вельмі цікавая метафарызацыя ў вершы не саступае ў эфектнасці перад іншай яго яркай асаблівасцю. Карціна надыходу вясны, якая павінна перш-наперш успрымацца зрокава, намалявана Грахоўскім пры дапамозе гукавых вобразаў.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Такім чынам, пейзажы С.Грахоўскага даюць падставу гаварыць пра тое, што побач з пейзажам зрокавым існуе не менш выразны пейзаж гукавы, напоўнены бясконцай разнастайнасцю гукаў шматлікай прыроды. Больш таго, увасабляючы пачуццёвыя ўражанні ў славеснай форме, паэтычная думка С. Грахоўскага не існуе без элементу музычнасці. Менавіта ў рытміцы верша, у яго гукавым афармленні надзвычай тонка ўлоўліваецца тое, што не змагло пэўным чынам раскрыцца на словах:

*Маланка б'е ўпоперак і ўздоўж*
*І ўспыхвае нібы сухое суччa,*
*Грукоча гром, і спорны дождж*
*Трысцё ламае, размывае кручы.*

*Рыпяць крывыя сосны на касе,*
*Кіпіць і вые ўспененая Нарач...*
("Рабінавая ноч" [4, с. 60]).

Гукі ў паэзіі С. Грахоўскага мы не толькі чуем, але і бачам. Дасягаецца гэта перш за ўсё іх нярэдкай колернай афарбоўкай: "паплыла смуга ліловым чадам да счарнелых зімнікаў і стрэх" ("Прадвесне"), "Па шыбах біла белае крыло; // Ліліся срэбрам грывы па спіне", "дрыжалі заінелыя балясы"; "белакрылых коней табуны"; "і ўсё наўкол было да болю бела" ("Белакрылыя коні"); "У стылай месячнай сінечы", "на лапах цёмнае яліны" (" У стылай месячнай сінечы" ); "сіні ранак" ( "Шпакі" ); "Мярэжы тонкай павуціны // Блішчаць халодным серабром"; "туманнай стыні", "яліны ў срэбраных шаломах" ("Зачараванасць"). Акрамя таго, гукі С.Грахоўскага набываюць і іншыя цікавыя і нечаканыя вызначэнні: ціхая трывога, вільготны гук, затуманеная ціш, звініць цішыня, трымціць цішыня. Часцей за ўсё характарызуецца цішыня, як звонкая, але бывае таксама нясмелай, глухой. З'яўленне такіх сінестэзій абумоўлена не абстрактнымі вывадамі, а метафарычнай характарыстыкай з'яў прыроды.

Назіранне над спосабамі перапляцення ў вершах гукаў і колераў дае магчымасць раскрыць яшчэ адну рысу пейзажу С.Грахоўскага. Нават той малюнак прыроды, які чытач без сумнення ўспрыняў бы зрокава, С.Грахоўскі заклікае паслухаць ( "Маладзік", "Зачараванасць", "На вярбе з ліста на тонкі ліст", "Ружовы гай", "Снежань", "Завіруха"):

*У поўнач скавытала і гуло,*
*Да рання нехта тупаў на балконе,*
*Па шыбах біла белае крыло,*
*І пралятаді ўзмыленыя коні.*

*Адзін, другі - ляцелі табуны*
*Над садам, над альтанкамі, платамі,*
*Храплі і задыхаліся яны*
*І грукалі па дахах капытамі*
("Белакрылыя коні" [4, с. 96]).

Аднак і пры гукавым успрыняцці малюнкаў прыроды вобразы С.Грахоўскага заўсёды прадметныя, адчувальныя. У пейзажах паэта арганічна спалучаецца тонкая музычнасць з маляўнічай насычанасцю, якой мастак аддае перавагу перад лёгкай празаічнасцю. Так, у вершы "Зімовы сум" С.Грахоўскі па-майстэрску стварае малюнак зімы. Выключная метафарычнасць твора (шалее завіруха, па вокны прызбы замяла, у коміне галосіць вецер глуха, снег на сонцы слепіць вочы, рыпіць пад палазамі і ступой, блакітам адлівае сярод ночы, тлеюць рысачкі святла) прызначана не столькі для перадачы прыродных працэсаў, колькі для перадачы стану чалавека – у роўнай ступені і душэўнага, і фізічнага, праводзячы з пейзажам цесную

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

ўзаемасувязь. С.Грахоўскі звычайна імкнецца расказаць не пра яго цераз сябе, а пра сябе цераз яго. І тады галоўнай мэтай паэта становіцца не прырода, а ўражанні ад яе, пейзаж адыходзіць на другі план і прызначаны толькі ўзмацняць гэтыя ўражанні:

*Такою мне мая радзіма сніцца,*
*Дзе ўсе шляхі завея замяла,*

*Такою любаю з далёкіх дзён*
*Яна прыходзіць у чароўны сон.*
*Снягі, і завіруха, і зіма,*
*І толькі там даўно мяне няма*
("Зімовы сум" [5, с. 62]).

Аднак функцыю пейзажа С.Грахоўскага нельга спрошчваць да адлюстравання пры яго дапамозе стану душы чалавека. У шматлікіх выпадках ён і сам выступае як аб'ект сузірання. У такіх выпадках, захоўваючы натуральнасць, С. Грахоўскі набліжае свае малюнкі прыроды да "чыстага пейзажу", калі настрой лірычнага героя поўнасцю згарманізаваны з настраёвасцю навакольнага свету ("Подых лета", "Рабінавы сок").

Практычна ідэальна "чыстых" пейзажаў у літаратуры не існуе. Звычайна пейзаж – гэта рух ад сузірання да самапаглыблення і зноў да прыроды, але ўжо ўключанай у плынь лірычных хваляванняў. Мастак не можа намаляваць карціну прыроды, не спраектаваўшы на яе свой душэўны стан, не выказаўшы(прама ці ўскосна) адносіны да яе (нават ужо ў выбары паэтычных сродкаў), не ўносячы элементу роздуму ў пейзажныя радкі.

Так, пейзажам С.Грахоўскага аднолькава ўласцівы і назіральнасць вока, і тонкі музычны слых, і ледзь-ледзь улоўныя пахі. Пагэтаму ў яго вершаваных радках прысутнічаюць рысы розных тыпаў пейзажаў. Мастак стварае надоўга запамінальныя свёй непаўторнасцю паэтычныя вобразы Радзімы, маці, каханай жанчыны, свайго сучасніка.

Дакладнай паэтычнай нагляднасці ў мастацкім творы часам бывае лягчэй дасягнуць пераводам адных адчуванняў у другія, а не звычайным, прамым іх выражэннем. Таму так арганічна злучаны ў пейзажах паэта вобразы зрокавыя і вобразы, створаныя пры дапамозе пахаў. Асацыяцыі звычайна вельмі простыя: пралескамі пахне бярозавы сок ("Пасля грому"), калыска, хата і труна пахнуць смольнаю сасною ("Люблю зямлю, што пахне лесам"), запахлі чорнаю смалой таполі ("Вясна").

*Люблю зямлю, што пахне лесам,*
*Люблю густой жывіцы дух,*
*Вільготны водар свежых трэсак,*
*І скрыпеня ружовы пух.*

*Зялёнае святло ігліцы*
*І пах сунічнае расы...*
("*Люблю зямлю, што пахне лесам*" [5, с. 47]).

Для перадачы пахаў паэт часцей за ўсё выкарыстоўвае два эпітэты: пахучы, духмяны.

Часам адчуванне само па сабе можа быць некалькі неакрэсленым, не заўсёды выразным: дыхнула з саду маладым вінам ("Белакрылыя коні"), запахла пад вечар з двара іскрынкамі першага снегу ("Жаданне"), пахнуць снегам мае наступныя гады ("Асенні дзень"). У такіх выпадках агульнае ўспрыманне карціны дасягаецца спалучэннем шматлікіх уражанняў, калі да зрокавага і пахавага далучаецца яшчэ і гукавое. Але і гукавое ўспрыманне з'яў бывае некалькі аўтаномным.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Гэта адбываецца часцей за ўсё ў момант найбольшага хвалявання, калі паэт, каб выказаць усю паўнату сваіх пачуццяў, шукае не проста слоў, а музычных гукаў, якія і дапамагаюць раскрыццю асноўнага зместу карціны прыроды. Паэт чуе, як шэпчацца калоссе ў полі, як у лясной глушы бярозавік звініць у гладышы, як асыпаюць бярозы лісты на палі; здольны

*Пад недасяжным зорным шляхам,*
*Падслухаць гоман баравы*
*І ... рогат лесуна у цёмным Дубні,*
*І ... плач савы, і як вядзьмар сівы*
*У апраметнай жаліцца на бубне*
("Пад месяцам" [5, с. 63]).

Значна часцей, чым расчлененасць шматлікіх уражанняў, С. Грахоўскі дасягае спалучэння выразных вобразаў пры дапамозе сінкрэтызму ўсіх трох тыпаў адчування: зроку, гуку і паху. Так нараджаецца аб'ёмны і шматмерны пейзаж :

*Даспелым жытам пахне цёплы вечар,*
*Расой і мёдам пырскае трава,*
*Ад хвалявання ніва горбіць плечы*
*У прадчуванні блізкага жніва.*

*На золку затуманеная ціша*
*Напнецца, затрымціць і задрыжыць:*
*Грымяць камбайны, а маланка піша*
*На сінім небе: "Жыту вечна жыць"*
("Жніво" [3, с. 335]).

Паэту ўдалося стварыць у сваіх творах цудоўны свет – свет прыроды, дзе "гукі свецяць, а колеры спяваюць, і пахі прымушаюць кахаць..." (К.Бальмонт). Прытым пейзажы мастака вызначаюцца выразнасцю, лаканічнасцю, паслядоўнасцю ўражанняў, але разам з тым яны заўсёды натхнёны вялікім пачуццём і абавязкова звязаны з роздумамі. А гэта азначае, што яны ніколі не бываюць нейтральнымі. Характар пейзажу загадзя вызначаецца прызначанай яму роляй у вершы. І паэт знаходзіць у ім менавіта тое, што хацеў знайсці, заключаючы ў пейзаж свае думкі.

## ЛІТАРАТУРА

1. ***Горелов А.А.*** Человек – гармония – природа. – М.: Сов. писатель, 1990.
2. ***Грахоўскі С.І.*** Выбраныя творы: У 2 т. – Мн.: Маст. літ., 1973. – Т 1. Паэзія.
3. ***Грахоўскі С.І.*** Выбраныя творы. У 2 т. – Мн.: Маст. літ., 1983. – Т 1. Вершы.
4. ***Грахоўскі С.І.*** Выбраныя творы. У 2 т. – Мн.: Маст. літ., 1994. – Т 1. Вячэрні звон: Вершы, паэмы.
5. ***Грахоўскі С.І.*** Недапісаная кніга: Вершы. – Мн.: Маст. літ., 1996.

## SUMMARY

*This article deals with the problem of the unity of man and nature based on the material of Grakhovsky's landscape lyrics; it reveals the mastery of Grakhovsky as landscape painter, good interlacement of features of different types of landscape in his poetic lines.*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова